# ПЫТАННІ БЕЛАРУСКАГА ШКОЛЬНІЦТВА Ў ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ Я. ЖУРБЫ НА СТАРОНКАХ «НАШАЙ НІВЫ»

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*ул. Кальварыйская, 9, 220030, г. Мінск, Рэспублика Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Разгледжаны публіцыстычныя творы Янкі Журбы на старонках газеты «Наша ніва», прысвечаныя праблемам станаўлення школьнай справы ў Беларусі на пачатку XX ст.

***Ключавыя словы:*** школьная адукацыя; нацыянальная інтэлігенцыя; настаўніцкі інстытут; беларускі рух; родная мова.

# ВОПРОСЫ БЕЛОРУССКОГО ШКОЛЬНОГО ДЕЛА В ПУБЛИЦИСТИКЕ Я. ЖУРБЫ НА СТРАНИЦАХ «НАШАЙ НІВЫ»

***П. Л. Дорощёнок***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220030, г. Минск, Республика Беларусь.*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Рассматриваются публицистические работы Янки Журбы на страницах газеты «Наша Ніва», посвященные проблемам становления школьного дела в Беларуси в начале XX в.

***Ключевые слова:*** школьное образование; национальная интеллигенция; учительский институт; белорусское движение; родной язык.

Першай справай, да якой прыступілі публіцысты «Нашай нівы» пасля стварэння газеты ў 1906 г., стала пытанне аб увядзенні беларускай мовы ў школьную справу і сістэму адукацыі ўвогуле. У пачатку XX ст. школьная справа ў беларускім краі не была як след арганізавана нават на ўзроўні пачатковага навучання.

Адной з педагагічных установ у заходніх губернях Расійскай імперыі, якія рыхтавалі настаўніцкія кадры для 6-гадовых гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ з навучаннем, разлічаным на 7 гадоў, быў Глухаўскі настаўніцкі інстытут на Чарнігаўшчыне. Паколькі настаўніцкія інстытуты ў беларускім краі адсутнічалі (Віцебскі настаўніцкі інстытут адчынены ў 1910 г., Магілёўскі – ў 1913 г.), беларуская студэнцкая дыяспара ў інстытуце ў 1906–1910 гг. была даволі прадстаўнічай. Сярод навучэнцаў інстытута знаходзіўся і будучы паэт і перакладчык Янка Журба (псеўданім Івана Якаўлевіча Івашына). Нарадзіўся ён у 1881 г. ў беднай сялянскай сям'і на Лепельшчыне, у сямнаццацігадовым узросце (1898 г.) стаў навучэнцам Полацкай настаўніцкай семінарыі. На працягу чатырох гадоў пасля яе заканчэння настаўнічаў у пачатковых школах Себежскага і Гарадоцкага паветаў былой Віцебскай губерні. А ў 1906–1909 гг. вучыўся ў Глухаўскім настаўніцкім інстытуце, які тады адносіўся да былой Чарнігаўскай губерні. Разам з землякамі ён актыўна ўдзельнічаў у працы нелегальнага беларускага гуртка. Гурткоўцы займаліся пашырэннем ведаў па беларусазнаўству, а трыбунай іх публіцыстычных выступленняў стала «Наша ніва» (Вільня), рэдакцыя якой запрашала навучэнцаў інстытута дасылаць у газету свае творы [1, с. 455].

Янка Журба дэбютаваў у журналістыцы ў 1902 г. як аўтар этнаграфічных нарысаў на старонках газеты «Витебские губернские ведомости». Першы яго паэтычны твор – верш «На беразе Дзвіны» – быў надрукаваны ў №№ 28–29 на старонках газеты «Наша ніва» за 1909 г. Па-беларуску Янка Журба пачаў пісаць у час навучання ў Глухаўскім інстытуце. З'яўляўся адным з аўтараў калектыўнага артыкула «Аб нацыяналізацыі школы», змешчаным у 1907 г. у «Нашай ніве». Публікацыя, якую падпісалі 36 беларускіх навучэнцаў інстытута, была прысвечана справе арганізацыі беларускай школы на роднай мове:

«Наша ніва», працягваючы гэту важную тэму, адкрыла рубрыку «Беларуская народная школа», дзе друкавала публіцыстычныя артыкулы і нататкі, прысвечаныя школьнаму пытанню. Студэнты Глухаўскага настаўніцкага інстытута, якія лічылі справу адукацыі на Украіне арганізаванай лепш, чым у Беларусі, разважалі на старонках газеты пра неабходнасць актывізацыі як настаўніцтва, так і навучэнцаў настаўніцкіх інстытутаў і семінарый у працэсе змагання за нацыянальную школу. Я. Журба, які ў 1909 г. пераклаў на беларускую мову вялікую працу ўкраінскага аўтара Д. Дарашэнкі «Беларусы і іх нацыянальнае адраджэнне», у прадмове да публікацыі ў газеце «Наша ніва» пісаў:

«Патроху пачынае шырыцца літаратура аб нашай нацыянальнай справе. У рускіх, польскіх, украінскіх, чэшскіх і іншых газэтах усё часцей пішуць а беларусах, аб іх нацыянальным адраджэнні. Вельмі цікавяцца беларусамі нашы браты ўкраінцы». Характарызуючы нарыс гісторыі беларусаў Д. Дарашэнкі, Я. Журба адзначаў, што апрача творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Вярыгі-Дарэўскага і Я. Купалы у ім павінны былі б больш шырока прадстаўлены Ф. Багушэвіч, І. Неслухоўскі (Я. Лучына) і Я. Колас, якія вельмі ўзбагацілі беларускую паэзію сваімі творамі [2, с. 49–50].

У шэрагу артыкулаў, змешчаных на старонках «Нашай нівы» пад агульным загалоўкам «Лісты з Украіны», Я. Журба закранаў розныя аспекты культурна-нацыянальнага супрацоўніцтва ўкраінцаў і беларусаў, звязаных агульным гістарычным лёсам. Аўтар «Лістоў з Украіны», адзначаў, што ў мінулым беларуская кніжная мова ўжывалася на вялікім абшары пражывання славянскага насельніцтва, а пісьменнікі XV–XVII стст. нават мелі намер стварыць адзіную мову для двух брацкіх народаў «у Заходняй і ў Палудзённай Русі». У пачатку XX ст. ініцыятывы аб сумеснай культурнай дзейнасці украінцаў і беларусоў падтрымлівалі пецярбургскія студэнцкія зямляцтвы. Перспектыву ўмацавання міжнацыянальных адносін паміж ўкраінцамі і беларусамі для развіцця блізкіх па духу нацыянальных культур Я. Журба абазначыў словамі ўкраінскага прафесара М. Грушэўскага: «У цесным братаньні, ў супольнасці ідэй свабоды і поступу няхай узрастае сіла гэтых народаў» [3, с. 200–202].

У чарговай публікацыі з Украіны Я. Журба зноў вяртаецца да пытання аб нацыяналізацыі школы. Апярэджваючы рашэнні ўсерасійскага з’езда настаўнікаў у Пецярбурзе (чэрвень 1909 г.), ён адзначаў, што справа нацыяналізацыі беларускай народнай школы – справа малавядомая для расійскага грамадства і настаўніцтва, таму трэба загадзя рыхтавацца да з’езду, каб мець усе матэрыялы аб яе патрэбах, ставіць пытанне аб беларускай гарадской і сельскай школе на мясцовы нацыянальны грунт і цесна звязваць нацыяналізацыю школы з агульнай рэформай гарадскіх вучылішчаў [4, с. 211–212].

Уздым беларускага руху, развіццё нацыянальнай літаратуры, барацьба за школу на роднай мове прывялі ў пачатку XX ст. да пашырэння сферы беларускасці за межамі краю, у чым вялікую ролю адыгрывала мэтанакіраваная праца публіцыстаў «Нашай нівы». Я. Журба адзначаў, што цікавасць да ўзнятых у беларускай прэсе пытанняў аб адукацыі

шырокіх слаёў насельніцтва на роднай мове праявілі ўкраінскія, расійскія, чэшскія і аўстрыйскія выданні. Рэдакцыя расійскага часопіса «Московский еженедельник» у дзясятым нумары за 1909 г. змясціла артыкул прафесара Бястужаўскіх вышэйшых жаночых курсаў А. Пагодзіна, ў якім адзначалася, што пачатак беларускай нацыянальнай прэсы – добрая і важная з'ява для ўсёй дзяржавы, а навучанне дзяцей у пачатковых школах на іх роднай мове мае вялікае значэнне для справы дэмакратызму.

Я. Журба узгадаў у тым жа артыкуле і зборнік «Формы национального движения в современных государствах», у якім была апублікавана праца А. Навіны «Беларусы». Пад гэтым псеўданімам друкаваўся вядомы беларускі публіцыст А. Луцкевіч, які пісаў, што «скрыўджэны і пагарджаны беларус стаў саромецца ўсяго, што аддзяляе яго ад паноў, стаў нават зрэкацца сваей роднай мовы аж да апошняга часу». Я. Журба, абапіраючыся на прыведзеныя ў артыкуле А. Навіны факты, адзначаў, што ідэя нацыяналізацыі школы на Беларусі пакрысе пачала праводзіцца ў жыццё – у Магілеўскай, Мінскай і Віленскай губернях створаны прыватныя школы з навучаннем дзяцей вядзецца па-беларуску [5, с. 280–281].

Калі студэнт Глухаўскага настаўніцкага інстытута Я. Журба, які распачаў пачаў на старонках «Нашай нівы» цыкл артыкулаў пад назвай «Лісты з Украіны», скончыў вучобу і настаўнічаў на Палтаўшчыне, а потым у родных Чашніках, яго справу падхапілі і працягнулі С. Палуян, Ц. Гартны, А. Навіна і многія іншыя выдатныя нацыянальныя дзеячы і публіцысты «нашаніўскага кругабегу». Беларуская школа на роднай мове стала тым трывалым падмуркам, на якім выраслі новыя пакаленні творцаў нацыянальнай культуры і сістэмы нацыянальнай адукацыі.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Журба Янка // Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. Т. 2. Верабей – Іваноў /Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь Белар. Энцыкл.; Пад рэд. А. В. Мальдзіса; Рэдкал.: І. Э. Багдановіч і інш. Мн.: БелЭн, 1993. С. 455–459.
2. *Дарашэнка Д.* Беларусы і іх нацыянальнае адраджэнне / Д. Дарашэнка // Наша ніва. 1909. № 4. С. 49–62.
3. *Журба Я.* Лісты з Украіны // Наша ніва. 1909. № 13–14. С. 200–202.
4. *Журба Я.* Лісты з Украіны // Наша ніва. 1909. № 15. С. 211–212.
5. *Журба Я.* Лісты з Украіны // Наша ніва. 1909. № 19. С. 279–281.